**Резюме**

Статья посвящена межнациональным отношениям на территории Западной Беларуси в период гитлеровской оккупации. Автором рассматривается эволюция немецко-фашистской политики в национальном вопросе. В работе раскрываются борьба и взаимодействия польской Армии Крайовой с оккупационным режимом и национальными движениями.

**Summary**

**Kraiova army and national communities of the grodno area during german occupation (1941-1944)**

**Barabash V.V.**

The article deals with the international relations on the territory of the Western Byelorussia during the Hitlerites occupation. The author observes the evolution of the national problem within the German fascist occupation policy. The struggle and cooperations of the Polish Kraiova Army with Hitlerites regime and national movements are shown in this paper.

УДК 947.6. “1944–1953”

## АДНОСІНЫ КАТАЛІЦКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БССР ДА КАНФЕСІЙНАЙ ПАЛІТЫКІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў 1944–1953 ГГ

**Рыбак Н.А.**

УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт”
г.Гродна, РБ

Канфесійная палітыка савецкай дзяржавы ў пасляваенныя гады характарызавалася ўзмацненнем дыктату над усімі рэлігійнымі арганізацыямі і імкненнем абмяжаваць іх уплыў на мясцовае насельніцтва. З гэтай мэтай у 1944 г. быў створаны Савет па справах рэлігійных культаў пры ўрадзе СССР [1, с.155]. Найбольшы ціск з усіх хрысціянскіх канфесій у пасляваенны час адчуваў каталіцкі касцёл, які разглядаўся прадстаўнікамі савецкай улады, як “наиболее реакционный из всех религиозных культов, существующих в БССР” [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.8]. Такая пазіцыя была вельмі зручнай для абгрунтавання рэпрэсіўнай палітыкі ў дачыненні да каталіцкага касцёла. У сувязі з гэтым разгарнулася кампанія па закрыццю касцёлаў. У выніку яе ва ўсходніх абласцях БССР у 1949 г. не засталося ніводнага дзейнага касцёла, а ў заходніх абласцях колькасць касцёлаў скарацілася амаль удвая (у 1939 г. налічвалася 416 касцёлаў, а на 1.07.1949 г. – ужо 231) [2, ф.4, воп. 62, спр.70, а.6]. Колькаць касцёлаў працягвала скарачацца і ў наступныя гады. Частка зачыненых касцёлаў пачала выкарыстоўвацца пад культурна-асветніцкія ўстановы і нават пад зернясховішчы. Так, згодна са



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

справаздачай упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў К.Уласевіча за III квартал 1949 г. было перададзена пад зернясховішча 17 касцёлаў рэспублікі, а ўсяго за 1949 г. лічба склала 33 касцёла [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.2, 6]. З кожным годам працягвала павялічвацца колькасць закрытых касцёлаў. На 1 красавіка 1951 г. налічвалася толькі 154 касцельных будынка, дзе праводзіліся службы. 75 касцёлаў выкарыстоўваліся пад склады, 28 – пад культурна-асветніцкія ўстановы, 18 былі заняты пад праваслаўныя храмы, 43 – пуставалі [3, с.252].

Насельніцтва каталіцкага веравызнання спрабавала аспрэчыць закрыццё касцёлаў і перадачу іх пад зернясховішчы. Вернікі пісалі скаргі ў Мінск і Маскву. Яны лічылі, што закрыццё касцёлаў – гэта самаўпраўства мясцовых уладаў і таму звярталіся з лістом-просьбай нерасрэдна да І.Сталіна [3, с.245]. У 1949 г. партыйна-савецкія органы ўлады атрымалі 6 скаргаў ад вернікаў 4 касцёлаў: г.п.Друі, в.Удзел і Нікалаева Полацкай вобласці, а таксама г.Высокае Брэсцкай вобласці. У гэтых скаргах каталікі патрабавалі вяртання касцельнаму камітэту зачыненых і перададзеных пад зернясховішчы касцёлаў [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.6]. Найбольшую цікавасць заслугоўвае скарга ад вернікаў г.Высокае Брэсцага раёна. У ёй камітэт не толькі скардзіўся на зачыненне касцёла, але і вандалізм, якім суправаджалася перадача касцёла пад зернясховішча. Пад час засыпкі зернем касцёла, былі папсаваны абразы, алтар і іншыя касцельныя рэліквіі [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.7].

Настроі насельніцтва адсочваліся органамі НКУС–МУС і кіраўніцтвам рэспублікі. Каб супакоіць ЦК КП(б)Б упаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў К.Уласевіч канстатаваў у 1949 г. скарачэнне агульнай колькасці скаргаў. Паводле яго “Інфармацыйнай справаздачы” за 3 квартал 1949 г.: “...ничтожное количество жалоб о возврате костёлов, засыпанных зерном, являются свидетельством значительного спада религиозного фанатизма у веруюших, даже католической церкви... С другой стороны, почти полное отсутствие жалоб является подтверждением благожелатального отношения верующих масс населения к использованию костёлов для хранения зерно-продукта...” [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.8]. На наш погляд, скарачэнне колькасці скаргаў, якія падаваліся вернікамі з прычыны зачынення касцёлаў, выклікана разуменнем людзьмі бессэнсоўнасці гэтага. Большасць скаргаў заставалася без увагі і аднавіць работу касцёлаў не ўдавалася. Яшчэ адной прычынай скарачэння скаргаў быў страх вернікаў перад рэпрэсіямі з боку НКУС–МУС БССР.

З 1947 г. яшчэ больш узмацніўся ціск у дачыненні да вернікаў і рымска-каталіцкага касцёла. У гэтым годзе пачынаецца рэгістрацыя касцёлаў і ксяндзоў з заключэннем тыпавых дагавароў на перадачу касцёлаў рэлігійным абшчынам. Чарговай мерай стала забарона ксяндзам

праводзіць рэлігійнае навучанне дзяцей. Калі ў першыя пасляваенныя гады ксяндзы накіроўвалі вялікія намаганні на рэлігійнае навучанне дзяцей і падрыхтоўку іх да першага прычасця, то ў канцы 1947 г. ксяндзам было забаронена праводзіць любыя заняткі з дзецьмі. За парушэнне гэтага загаду яны прыцягваліся да судовай адказнасці [3, с.248]. Аднак, нягледзячы на гэтую забарону ксяндзы па жаданню бацькоў не спынялі рэлігійнага навучання дзяцей. Пры касцёлах нават існавалі "заканспіраваныя" арганізацыі ("Ружанец", "Тэрцыярый"), у якіх вялася падрыхтоўка дзяцей да першага прычасця. Партыйна-савецкія работнікі БССР патрабавалі, каб дзейнасццю гэтых арганізацый заняліся органы МУС [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.22].

Дзеці актыўна наведвалі касцёлы, пры гэтым часта замест школьных заняткаў. Гэта адзначалася ў справаздачах упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў К.Уласевіча. Так, 15 жніўня 1949 г. ён зафіксаваў выпадак наведвання касцёла ў в.Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна некалькімі дзяўчынкамі ва ўзросце 10–12 год. 28 верасня 1949 г. у касцёле в.Слабодка Браслаўскага раёна 52 школьніка на працягу 2 гадзінаў былі на споведзі ў ксяндза-дэкана Ч.Кударэўскага, пры гэтым усе яны адсутнічалі на школьных занятках. У гэты ж дзень у касцёле г.Глыбокае Полацкай вобласці ксёндз спавядаў вучаніцу 4 класа – піянерку [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.20–21]. Цікавым з'яўляецца той факт, што, калі супрацоўнікі партыйна-савецкіх органаў выклікалі ксяндзоў, якія займаліся навучаннем дзяцей ці спавядалі іх у касцёлах, для "размовы", то яны адказвалі: "ксёндз у касцёле не мае права нікому адмаўляць у споведзі, у тым ліку дзецям, тым больш, што гэтага жадаюць іх бацькі" [2, воп.62, спр.69, а.20]. Звычайна пасля падобнай "размовы" ксяндзоў папярэджвалі, што, калі гэты выпадак паўторыцца, то касцёл будзе зачынены, а вінаватыя прыцягнуты да крымінальнай адказнасці [2, воп.62, спр.69, а.20].

З 1948 г. у БССР уводзілася паступовая забарона ксяндзам абслугоўваць больш за адзін прыход ці касцёл і раз'язджаць па іншым касцёлам, дапамагаючы ў набажэнствах іншым ксяндзам. Гэтая забарона дзейнічала і ў дні вялікіх рэлігійных святаў, такіх як, Божае Нараджэнне, Пасха, Троіца і інш. Ужо ў 1949 г. партыйна-савецкія чыноўнікі канстатуюць спыненне раз'ездаў ксяндзоў па іншым касцёлам і прыходам [2, ф.4, воп. 62, спр.70, а.14–15]. Рабілася гэта з мэтай змяншэння наведвання касцёлаў вернікамі. Аднак, нягледзячы на палітыку, накіраваную на зачыненне касцёлаў, узровень рэлігійнасці насельніцтва заставаўся вялікім. Колькасць вернікаў не толькі не змяншалася, а, наадварот, павялічвалася. У першую чаргу гэта тычылася тых касцёлаў, дзе набажэнства вялося ксяндзамі. Іх наведвалі з наваколля і прыходаў, якія засталіся па розных прычынах без ксяндзоў. Такім чынам,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

наведванне касцёлаў у 1949 г. у параўнанні з 1948 г., па афіцыйнай інфармацыі, значна павялічылася. Так, 15 жніўня 1949 г. у свята Ўспення Багародзіцы колькасць наведвальнікаў касцёла ў в.Чарнаўчыцы Брэсцкай вобласці перавысіла тысячу чалавек, у тым ліку і з суседніх прыходаў. Большасць вернікаў склалі жанчыны сярэдняга ўзросту ад 20 да 45 гадоў, мужчыны склалі меньшасць і ў асноўным сярэдняга і сталага ўзросту ад 30 да 50 гадоў. Моладзь склала 20% ад усіх вернікаў. У касцёле ў час набажэнства таксама прысутнічалі дзеці школьнага ўзросту [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.16–17].

Не меньш актыўна наведвалі вернікі іншыя касцёлы рэспублікі. Так, 25 верасня 1949 г. у звычайны нядзельны дзень у Рубяжэвіцкім касцёле Баранавіцкай вобласці было каля 600 вернікаў, прычым значная колькасць прыехала з Мінскай вобласці і г.Мінска. Нягледзячы на забарону савецкіх уладаў у гэты дзень былі павенчаны маладыя з Дзяржынскага раёна, а таксама ахрышчаны 8 немаўлят. Адное з іх было прывезена аж з Мінска на аўтамабілі. Мясцовыя органы МУС хутка высвятлілі каму належаць нумары і сам аўтамабіль [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.17]. Не цяжка ўявіць, што чакала бацькоў гэтага дзіцяці.

Органы савецкай улады вывучалі якія катэгорыі насельніцтва часцей звяртаюцца да ксяндзоў. На прыкладзе раёнаў Полацкай вобласці была зроблена выснова, што большасць сельскага насельніцтва ўсе абрады (вянчанне, хрышчэнне, пахаванне і інш.) ажыццяўляюць з удзелам ксяндзоў [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.18]. Кіраўніцтва БССР хвалявала тэндэнцыя, калі шэрагі вернікаў папаўняліся за кошт інтэлігенцыі і прадстаўнікоў мясцовай улады. Некаторыя з іх прымалі ўдзел у дзейнасці выканаўчых органаў рэлігійных арганізацый, а ў выніку гэта магло прывесці да звальнення з работы, выключэння з партыі ці камсамолу. Так, у 1953 г. у склад касцельнага камітэту ў в.Мяжырэчы Зэльвенскага раёна ўваходзіў старшыня сельсавета І.Нячыпар, у в.Азёры Скідзельскага раёна – старшыня калгаса І.Касцюц. Узначальваў касцельны камітэт у в.Паперня Лідскага раёна старшыня мясцовага калгаса А.Серафімовіч [3, с.252–253].

Каб зменшыць уплыў касцёла на вернікаў адразу пасля вайны пракацілася новая хваля рэпрэсій супраць ксяндзоў. Іх дзейнасць ацэньвалася як “антысавецкая” і “рэакцыйная”. Савецкія ўлады тлумачылі арышты ксяндзоў тым, што апошнія выступалі супраць афіцыйнай палітыкі дзяржавы. Па рэспубліцы за 10 гадоў (з 1939 па 1949 г.) колькасць ксяндзоў скарацілася ў 4 разы [2, ф.4, воп.62, спр.70, а.8–9]. Зразумела, што арышты ксяндзоў працягваліся і пазней. Рэакцыя на рэпрэсіі супраць каталіцкага духавенства з боку мясцовага насельніцтва, згодна з афіцыйнай інфармацыяй, была быццам бы пазітыўнай. Як адзначаў у сваёй справаздачы ўпаўнаважаны Савета па справах



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

рэлігійных культаў К.Уласевіч у 1949 г.: “Верующие правильно расценивают аресты ксендзов, как заслужанную расправу за вмешательсво в политические дела. Другая часть верующих считают, что рано или поздно костёлы должны быть переданы под клубы, ксендзы арестованы, а католическое население переведено на православную веру... (верующий Гончар из воропаевского прихода Полоцкой области)” [2, ф.4, воп.62, спр.69, а.14–15]. На нашу думку, да гэтай высновы К.Уласевіча трэба ставіцца скептычна. На самой справе большасць вернікаў спачувалі арыштаваным ксяндзам, але адкрыта выказаць сваю пазіцыю ва ўмовах таталітарнага рэжыму не маглі.

Яшчэ адным мерапрыемствам савецкай улады, накіраваным на змяншэнне ўплыву каталіцкага касцёла на насельніцтва, стала антырэлігійная агітацыя, што разгарнулася сярод вернікаў. Так, на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б ад 18 лістапада 1947 г. было прапанавана Гродзенскаму, Маладзечанскаму, Брэсцкаму, Баранавіцкаму, Полацкаму і Пінскаму абкамам КП(б)Б “развернуть через печать пропаганду... по разоблачению антисоветской, антинародной деятельности католического духовенства” [2, ф.4, воп.61, спр.473, а.21].

Аднак, вышэй адзначаны комплекс мераў, прыняты савецкай уладай з мэтай паслаблення ўплыву рымска-каталіцкай царквы на мясцовае насельніцтва не даў чаканых вынікаў. Узровень рэлігійнасці насельніцтва заставаўся вялікім. Асабліва гэта тычылася заходніх абласцей БССР. Згодна са справаздачай упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў за 1949 г. адзначалася: “...в западных областях католицизм имеет ещё довольно глубокие корни среди населения и является наиболее распространённой религией по сравнению с другими религиозными культами” [2, ф.4, воп.62, спр.70, а.5]. На конт усходніх абласцей рэспублікі ў гэтай жа справаздачы канстатавалася: “Отсутствие костёлов и ксендзов в восточных областях БССР не означает, что не осталось ни одного верующего католика. Католики здесь есть, но, не будучи оформлены и организованы рамками общины и не имея костёлов и ксендзов, они не представляют из себя величины, заслуживающей особого внимания” [2, ф.4, воп.62, спр.70, а.4]. У пачатку 50-х г. працуючыя касцёлы працягвалі збіраць немалую колькасць вернікаў. Так, парафія Гродзенскага фарнага касцёла налічвала каля 3000 вернікаў. Толькі за першую палову 1953 г. на святах у храме прысутнічала 3500 чалавек, адбылося 35 хрышчэнняў, 10 вянчанняў, 6000 споведзяў. Яшчэ больш унушальнымі былі паказчыкі ў сельскіх парафіях. Так, у в.Баруны Ашмянскага раёна налічвалася каля 1800 вернікаў, а колькасць наведвальнікаў у вялікодныя дні даходзіла да 3500 чалавек [3, с.253].

Такім чынам, закрыццё касцёлаў, арышты ксяндзоў і антыкасцельная агітацыя і прапаганда не знайшлі падтрымкі і водгуку ў каталіцкіх



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

вернікаў. У цэлым, барацьба савецкай дзяржавы з рымска-каталіцкай царквой была негатыўна сустрэта мясцовым насельніцтвам. Яны спрабавалі супрацьстаяць закрыццю касцёлаў, напрацягу ўсяго пасляваеннага дзесяцігоддзя пісалі скаргі і патрабавалі вяртання ім касцёлаў. Нягледзячы на забарону, дзеці прымалі даволі актыўны ўдзел у рэлігійным жыцці. Сацыяльны склад вернікаў быў стракаты: сяляне-калгаснікі, інтэлігенцыя, гараджане. Некаторая лібералізацыя ў адносінах да рымска-каталіцкай царквы і духавенства назіраецца толькі пасля смерці І.Сталіна ў 1953 г.

Літаратура і крыніцы:
1. Ярмусик Э. Католический костёл в Белоруссии в годы Второй мировой войны (1939–1945).– Гродно: ГрГУ, 2002.– 240 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь у Мінску.
3. Канфесіі на Беларусі (к.XVIII–XX ст.)./ В.Грыгор'ева, У. Завальнюк, У.Навіцкі, А.Філатава; Навук. рэд. У.Навіцкі.– Мн.: Экаперспектыва, 1998.– 340 с.

**Резюме**
**Отношение католического населения бсср к конфессионной политике советской власти в 1944–1953 г.**
**Рыбак Н.А.**

В статье рассматривается отношение населения католического вероисповедания БССР к мероприятиям, проводимым советской властью в отношении римско-католической церкви в 1944–1953 г.

**Summary**
**The relation of the catholic population of bssr To konfessional politics of the soviet authority in 1944–1953**
**Rybak N.A.**

In article the relation of the population of Catholic creed of BSSR to measures spent by the Soviet authority concerning Catholic Church in 1944-1953 is considered.

УДК 930.1(476)

## НАУЧНЫЕ ИСТОРИЧЕСКИЕ КОНФЕРЕНЦИИ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ В 1990-Е ГГ.

**Минич А.П.**

УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»
г. Гродно, Республика Беларусь

Демократические процессы в стране открыли новые возможности для исторической науки. В начале 1990-х годов формируется новая культура научного общения. Конференции, симпозиумы, семинары, «круглые столы» сделали возможным оперативно обмениваться мнениями. В со-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ